(https://palesse.press/)

Шукаць

(https://www.facebook

Раёны (https://palesse.press/category.php?slug=areas)

Правы чалавека (https://palesse.press/category.php?slug=hr)

Грамадства (https://palesse.press/category.php?slug=society)

Экалогія (https://palesse.press/category.php?slug=ecology)

Палітыка (https://palesse.press/category.php?slug=policy)

Эканоміка (https://palesse.press/category.php?slug=economy)

У Мазыры маці трох дзяцей прысудзілі штраф за тое, што была на вуліцы з дзіцячым вазком

Палеская Вясна 29.12.2020

Нягледзячы на працэсуальныя парушэнні і прамінулы тэрмін прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, жанчыну прызналі вінаватай і пакаралі.

На **Кацярыну Лявонаву** яшчэ ў кастрычніку склаў пратакол участковы інспектар Мазырскага РАУС **Аляксандр Вітчанка**. Ён абвінаваціў жанчыну ў тым, што яна ўзяла ўдзел у так званым «несанкцыянаваным масавым

мерапрыемстве». Але ў матэрыялах адміністрацыйнай справы было занадта шмат хібаў, таму суд накіраваў яе назад у РАУС на дапрацоўку. І так адбывалася двойчы.

4 снежня сыходзіў двухмесячны тэрмін прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці. І дата складання апошняга пратакола, паводле якога Кацярыну Лявонаву судзілі 28 снежня, пазначаная 2 снежня. Прычым, напярэдадні мінавання тэрміну прыцягнення да адказнасці пратакол ужо перапісаў старшы ўчастковы інспектар маёр **Андрэй Ляўданскі**. У той жа дзень Кацярыне накіравалі праз СМС позву ў суд на раніцу 3 снежня.

Але ў Кацярыны трое дзетак. Малодшаму ўсяго 8 месяцаў. Таму яна хадайнічала аб пераносе разгляду справы, бо не мела магчымасці азнаёміцца з ёй і падрыхтавацца да суда. Разгляд адбыўся 28 снежня. У будынак суда Кацярына мусіла прыйсці з малодшым дзіцём у вазку, бо яго няма на каго пакінуць.

Кацярына Лявонава (з правага боку) перад залай для судовых паседжанняў.

Кацярыне Лявонавай ставілі ў віну тое, што яна 4 кастрычніка нібыта ўзяла актыўны ўдзел у мірным сходзе. Прадстаўнікі дзейнай улады называюць мірныя сходы і нават адзіночныя пікеты «несанкцыянаванымі масавымі мерапрыемствамі», бо, паводле ўведзеных гэтай уладай нормаў, на ажыццяўленне свайго права на мірны сход і выказванне свайго меркавання чалавек мусіць атрымаць санкцыю ад прадстаўнікоў гэтай самай улады. Такіх санкцыяў улады не даюць, бо звычайна і сходы, і меркаванні, якія выказваюцца, крытыкуюць гэтую ўладу.

> «*На бульвары, дзе на мяне напісалі пратакол, я павольна праходжвалася з дзіцём у вазочку. Дзіцё спало. Была разам з сярэднім дзіцёнкам. Я чакала куму, якая там недалёка жыве. Побач гуляліся іншыя дзеці. Былі іншыя людзі. Раптам аднекуль з'явіліся прадстаўнікі карных структураў і пачалі гучна крычаць у мегафон. Яны крычалі, што знаходжанне людзей на бульвары – гэта масавае мерапрыемства і яно незаконнае. Загадвалі нам разыйсціся. Пры гэтым ў мне асабіста не было аніякіх плакатаў, сімволікі ці нечага яшчэ, што можна было б расцаніць як выказванне меркаванняў. Не бачыла я нічога такога і ў іншых прысутных там людзей. Ні я, ніхто іншы не выказвалі аніякіх лозунгаў альбо заклікаў. Але сваімі крыкамі ў мегафон міліцыянты напужалі маё дзіця. Яно пачало плакаць. Я выказала заўвагу пра гэта маёру Ляўданскаму. Ён адказаў, што я такім чынам пратэстую і павінна сыйсці адтуль. У нас завязалася невялікая сварка. І я думаю, што менавіта ў сувязі з гэтым асабіста Ляўданскі прыклаў намаганні, каб мяне пакаралі*», – сказала Кацярына Лявонава.

Тое, што ў яе не было ніякай атрыбутыкі ці сімволікі пацвердзіў і відэазапіс, аб разглядзе якога хадайнічала Лявонава. Але на вынік судовага паседжання гэта не паўплывала. Рапарты міліцыянтаў адыгралі для суддзі больш важкую ролю, ніж відавочны доказ, які абвяргае абвінавачванне.

Суддзя **Галіна Кніжонак-Максімава** падпісала пастанову аб прызнанні Кацярыны Лявонавай вінаватай у здзяйсненні адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага часткай 3 артыкула 23.34 КабАП і прызначэнні ёй пакарання ў выглядзе штрафу на 540 рублёў.

29.5k
Shares

0 Comments

Login

Start the discussion...

LOG IN WITH

OR SIGN UP WITH DISQUS

Name

Share

Best Newest Oldest

Be the first to comment.

Subscribe Privacy Do Not Sell My Data

DISQUS



(http://spring96.org/be)

ПАПУЛЯРНЫЯ НАВІНЫ

Напрыканцы года ў Лоеве прызначылі" новую "экстрэмістку" (https://palesse.press/news.php?slug=7881)

Жорж Кунцэвіч 29.12.2023

Светлагорск: заўважныя першыя пікеты па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты (https://palesse.press/news.php?slug=4094)

Жорж Кунцэвіч 29.12.2023

Каго збіраецца вылучаць у абласны савет дэпутатаў Мазыршчына? (https://palesse.press/news.php?slug=1807)

Жорж Кунцэвіч 27.12.2023

Рэчыца: адзінокі пікет па зборы подпісаў на ўваходзе ў краму (https://palesse.press/news.php?slug=7077-1)

Жорж Кунцэвіч 04.01.2024

Калінкавічы: “Белая Русь” і КПБ заклікаюць да ўдзелу ў выбарах і распавядаюць пра свае планы (https://palesse.press/news.php?slug=0760)

Жорж Кунцэвіч 28.12.2023

У мазырскай ПУАТ на пачатак 2024 года – 18 палітзняволеных. Хто яны? (https://palesse.press/news.php?slug=9483)

Цімур Казачэнка 11.01.2024

У “Спіс экстрэмістаў” дадалі жыхара Мазыра Антона Кашаеда (https://palesse.press/news.php?slug=7555-1)

Жорж Кунцэвіч. 12.01.2024

Дзе на Палессі найбольш напружаная сітуацыя з працай? (https://palesse.press/news.php?slug=6119-1)

Жорж Кунцэвіч 04.01.2024

У студзені дні народзінаў адзначаюць палітвязні, якія адбываюць пакаранне ў Мазыры (https://palesse.press/news.php?slug=4979)

Жорж Кунцэвіч 07.01.2024

Перабор у Калінкавічах: прадстаўнікі праўладных арганізацый заклікаюць да ўдзелу у выбарах (https://palesse.press/news.php?slug=4669)

Жорж Кунцэвіч 08.01.2024

ЗВЯЗАЦЦА З НАМІ

contact@palesse.press

Перадрук і цытаванне матэрыялаў парталу дазваляецца з абавязковай актыўнай індэксуемай гіперспасылкай на сайт palesse.press не ніжэй за другі абзац.